ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 2 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 947.6«1921/1939»–053.81(=411.16)]:329*

*В. В. ДАНІЛОВІЧ*

# ЯЎРЭЙСКІЯ МАЛАДЗЁЖНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1929 гг.)

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 03.02.2015)*

Як вядома, у Савецкай Беларусі значную колькасць насельніцтва складалі яўрэі: калі ў 1927 г. тут пражывала 407,1 тыс. яўрэяў, то ў 1931 г. – 440,2 тыс., у 1937 г. – 363,2 тыс., у 1939 г. – 375,1 тыс. чалавек [1, s. 92]. Увогуле БССР стала займала трэцяе месца сярод рэспублік СССР па колькасці яўрэяў, хаця іх доля і зменшылася з 15,2 % (1926 г.) да 12,4 % (1939 г.) [2, p. 14]. Дарэчы гэта была самая актыўная нацыянальная меншасць. Яе прадстаўнікі дзейнічалі фактычна ва ўсіх адгалінаваннях палітычнага спектра краіны.

У сакавіку 1921 г. у трох паветах ССРБ і Мінску сярод маладых яўрэяў мелася невялікая колькасць членаў сацыял-дэмакратычнага Югенд-Бунда. Яго арганізацыі выступалі за зліццё з КСМБ, што і адбылося ў канцы сакавіка 1921 г. [3, л. 22–22а, 24]. Гэта сведчыць аб перавазе ў асяроддзі моладзі камуністычных ідэй над сацыял-дэмакратычнымі і перспектыўнасці дзейнасці камсамола ў тым ліку і ў плане адстойвання інтарэсаў яўрэйскіх працоўных юнакоў і дзяўчын.

Разам з тым яўрэі спрабавалі захаваць на камуністычным палітычным полі асобны маладзёжны яўрэйскі сектар. Так, у ССРБ працягваў дзейнічаць Яўрэйскі камуністычны саюз моладзі (ЯКСМ). У сакавіку 1921 г. арганізацыя яўкамола мелася толькі ў Мінску. На працягу года яна налічвала 80–90 членаў і працавала даволі актыўна. Пры яе клубе дзейнічалі курсы па ліквідацыі непісьменнасці і бібліятэка-чытальня. Мінская арганізацыя ЯКСМ найбольш актыўна вяла ваенна-спартыўную працу (рэгулярныя заняткі з трыма групамі юнакоў і дзяўчын). Нягледзячы на тое, што стары гарадскі клуб яўкамола закрылі, быў створаны новы, у які прыходзіла шмат маладых яўрэяў. У выніку ў Мінску паспяхова прайшоў тыдзень умацавання ЯКСМ, рэгулярна адбываліся заняткі ў фарбандшколе, часта праводзіліся абмеркаванні хвалюючых яўрэйскую моладзь пытанняў. Пры гэтым сцвярджалася, што яўкамол – адзіная арганізацыя ў Мінску, якая робіць штосьці пазітыўнае для яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын [4, с. 2; 5, л. 9; 6, л. 98]. Акрамя таго, ЯКСМ у Беларусі арганізоўваў дапамогу яўрэям, пацярпелым ад бандытызму [7, л. 24]. Як бачым, яўкамол вёў даволі актыўную дзейнасць і меў значныя матэрыяльныя сродкі, якія мог накіроўваць нават на дабрачынныя мэты.

I Усебеларуская канферэнцыя ЯКСМ адбылася ў Мінску 15 сакавіка 1921 г. Старшынёй Галоўнага камітэта Беларусі (ГКБ) яўкамола быў абраны Зільберберг, а таксама канстатавалася, што, нягледзячы на перашкоды з боку яўсекцый КП(б)Б і КСМБ, шэрагі ЯКСМ у Беларусі растуць кожны дзень [8, л. 1]. Гэта сведчыць аб падтрымцы дзейнасці саюза яўрэйскай моладдзю.

У ЯКСМ прымалі маладых яўрэяў ва ўзросце 14 – 23 гадоў. Члены саюза былі абавязаны весці ўсюды прапаганду пераходу да прадукцыйнай працы на нацыянальных калектыўных пачатках, наведваць мітынгі, гутаркі і лекцыі камуністычных арганізацый. Распаўсюджваліся нават друкаваныя заклікі да яўкамольцаў аб неабходнасці змагання за мэты ЯКСМ. Усё гэта сведчыць аб імкненні кіраўніцтва яўкамола да таго, каб, з аднаго боку, члены саюза мелі як мага больш поўнае ўяўленне аб развіцці камуністычных ідэй, а з другога – актыўна адстойвалі погляды сваёй

арганізацыі. Пры гэтым у саюзе існавала даволі жорсткая дысцыпліна. Так, яўкамольцы, якія 3 разы запар не з'ўляліся на агульныя сходы без уважлівых прычын, выключаліся з арганізацыі. Членам саюза нават забаранялася выязджаць за межы населенага пункта без паведамлення мясцоваму камітэту ці адказнаму сакратару [9, л. 2, 23; 10, л. 18].

Неабходна адзначыць, што з першых дзён сваёй дзейнасці ЯКСМ лічыў камсамол брацкай арганізацыяй (аднак шэраг яўкамольцаў успрымалі яўсекцыі КП(б)Б і КСМБ як органы асіміляцыі яўрэяў). Улады ж ССРБ імкнуліся перашкодзіць працы яўкамола: не давалі памяшканняў пад клубы і пропускаў яўкамольцам для праезду на І Усебеларускую канферэнцыю ЯКСМ, зрывалі разам з камсамольцамі сходы мясцовых арганізацый яўкамола, забаранялі яго масавыя мерапрыемствы [10, л. 21 – 22]. Такое становішча сведчыць аб тым, што яўкамол з'яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскай моладзі.

У красавіку 1921 г. некаторыя члены ЯКСМ абвінавацілі старшыню ГКБ Зільберберга ў дыктатарскім стылі кіравання. Сапраўды, сярод кіраўніцтва яўкамола ССРБ назіраліся выпадкі перавышэння ўлады і выкарыстання службовага становішча [11, л. 22]. Разгарнулася ўнутраная барацьба, якая перашкаджала працы саюза і прывяла да поўнага хаосу ў яго Мінскай арганізацыі, якая фактычна распалася [6, л. 14]. У выніку ў красавіку – снежні 1921 г. ЦК ЯКСМ вёў актыўную перапіску з ГКБ і мясцовымі арганізацыямі Беларусі па пытаннях працы саюза [7, л. 1–40; 9, л. 1–25; 11, л. 1–83].

Увогуле яўкамол Беларусі лічыўся вельмі маладым і адставаў ад іншых арганізацый ЯКСМ у многіх галінах саюзнай дзейнасці. У Мінску 10 ліпеня 1921 г. адбылася ІІ Усебеларуская канферэнцыя яўкамола (выбарная квота для ўдзелу ў ёй складала 1 дэлегат ад 10 членаў, але не больш 4 дэлегатаў ад адной арганізацыі). Старшынёй ГКБ ЯКСМ зноў быў абраны Зільберберг [11, л. 66], што сведчыць, нягледзячы на ўсе абвінавачванні, аб яго пэўным аўтарытэце ў саюзе. Разам з тым у ліпені – жніўні 1921 г. у ГКБ яшчэ працягвалася ўнутраная барацьба прыхільнікаў і праціўнікаў старшыні [5, л. 31].

Пасля канферэнцыі праца яўкамола ў Беларусі значна актывізавалася. ГКБ дало ўказанне аб усеагульным ваенным навучанні членаў саюза і аб патрабаванні ад камітэтаў КП(б)Б уключэння ўсіх яўкамольцаў у атрады асобага прызначэння. У выпадку адмовы ставілася задача патрабаваць інструктара ад тэрытарыяльнага палка і ствараць такія атрады пры сваіх камітэтах. Уся гэта праца павінна была весціся ў кантакце з Яўрэйскай камуністычнай партыяй (ЯКП) праз стварэнне сумесных змяшаных камісій [11, л. 68]. Як бачым, ЯКСМ у Беларусі па даручэнні яўкампартыі спрабаваў нават стварыць фактычна ўласную ўзброеную апору. Больш таго, ва ўсіх месцах, дзе не было арганізацый яўкамола, клубныя праўленні ці парткамы ЯКП арганізоўвалі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын у секцыі пры клубах на платформе ЯКСМ. Там, дзе арганізацыі саюза былі, але не мелі сваіх клубаў, ім дазвалялі карыстацца памяшканнямі клубаў і устаноў яўкампартыі. Пры гэтым арганізацыі яўкамола дэлегавалі ў клубныя праўленні сваіх прадстаўнікоў з правам рашаючага голасу. Парткамы і клубныя праўленні ЯКП абавязваліся спрыяць стварэнню і працы ўласных клубаў ЯКСМ [11, л. 28]. Усё гэта сведчыць аб шчыльным узаемадзеянні дзвюх арганізацый.

Аднак яўсекцыі КП(б)Б і КСМБ прынялі цэлы шэраг мер для барацьбы з яўкамолам, у тым ліку праз СМІ і распаўсюджванне дыскрэдытуючай інфармацыі. У адказ ЯКСМ выдаў улётку да маладых яўрэйскіх рабочых, якая абвяшчала аб жаданні саюза супрацоўнічаць з беларускай рабоча-сялянскай моладдзю [9, л. 3, 14]. Як бачым, насуперак афіцыйнай прапагандзе яўкамол спрабаваў давесці, што ён незамкнёны ў вузканацыянальных яўрэйскіх рамках. Але прыкладаў рэальнага супрацоўніцтва саюза з юнакамі і дзяўчынамі іншых нацыянальнасцей намі не выяўлена.

Акрамя таго, пэўныя групы членаў (у тым ліку з кіраўнічага складу) выходзілі з ЯКСМ у Беларусі з-за нацыянальна-шавіністычнай і дробнабуржуазнай палітыкі саюза. Многія яўкамольцы пераходзілі ў КСМБ і толькі некаторыя з іх уступалі ў яўкамол зноў [5, л. 32; 9, л. 3; 12, л. 18]. Такое становішча сведчыць аб тым, што ЯКСМ у цэлым здаваў пазіцыі ў барацьбе з камсамолам.

Яўкамол спрабаваў супрацьстаяць падзенню свайго іміджу праз пашырэнне інфармацыі, якая стварала прыцягальны вобраз ЯКСМ, у тым ліку і заведама неадпавядаючай рэчаіснасці. Так, яўкамол распаўсюджваў чуткі аб тым, што да яго жадае далучыцца Яўрэйскі сацыялістычны саюз

рабочай моладзі «Югенд Паалей-Ціон» (ЯССРМ «ЮПЦ»), якія былі абвергнуты ЦК апошняга [13, л. 46].

У выніку рашэннем вышэйшага кіраўніцтва яўкамола ГКБ было ліквідавана 31 кастрычніка 1921 г., а на тэрыторыі Савецкай Беларусі былі створаны 2 губкамы ЯКСМ: Мінскі і Гомельскі [14, л. 1].

Усяго ў 1921 г. арганізацыі яўкамола дзейнічалі ў 34 населеных пунктах ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губерняў. Напрыканцы года зноў назіраўся рост іх уплыву ў асяроддзі яўрэйскай рабочай моладзі. Прычым у Віцебскай і Гомельскай губернях шэраг мясцовых арганізацый ЯКСМ адкрыта выступалі пад лозунгам барацьбы за яўрэйскую самастойнасць [10, л. 1–22; 15, л. 1; 16, л. 6], што сведчыць аб новым росце нацыяналістычных настрояў сярод ярэйскіх юнакоў і дзяўчын.

Разам з тым арганізацыям яўкамола не хапала прапагандысцкай літаратуры. З мэтай вырашэння гэтай праблемы ў снежні 1921 г. у ССРБ актыўна распаўсюджваўся «Бюллетень Центрального комитета Еврейского коммунистического союза молодёжи» [4, с. 1; 5, л. 8]. З 1 мая 1922 г. пачаў выдавацца і распаўсюджвацца ў ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губернях часопіс «Юный еврейский коммунист», які з'яўляўся органам ЦК яўкамола [17, л. 1].

У 1922 г. III Фарбандсрат ЯКСМ адзначаў аслабленне тэмпаў развіцця саюза, у тым ліку ў ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губернях, з-за вынікаў нэпа, адсутнасці ідэйна-выхаваўчай працы, арганізацыйнай раскіданасці, цяжкіх праследаванняў з боку яўсекцый кампартыі і камсамола. ЯКСМ адчуваў недахоп кадраў. Напрыклад, не было фарбандаўцаў-спецыялістаў для кіраўніцтва ваеннафізкультурнай працай на месцах. Нягледзячы на гэта, фарбандшколы яўкамола працягвалі весці палітасветную працу, а для ўзмацнення сувязі цэнтра з месцамі ў ССРБ было створана Бюро ЯКСМ у Мінску [18, л. 1–2, 4].

Аднак з-за супрацьдзеяння савецкіх улад наладзіць працу ЯКСМ не ўдавалася. Таму III Усерасійская канферэнцяя яўкамола 23 студзеня 1923 г. прыняла рашэнне аб ліквідацыі саюза і ўступленні яго членаў у камсамол. У сваю чаргу 13 красавіка 1923 г. ЦК КСМБ прыняў рашэнне аб уключэнні ў свой склад ЯКСМ. Для прыняцця яго членаў у камсамол была створана адмысловая камісія з 2 прадстаўнікоў КСМБ і 1 прадстаўніка яўкамола [19, л. 1].

Нягледзячы на прынятае рашэнне, канчатковага зліцця не адбылося. Так, у 1926 г. у Мінску дзейнічала група яўрэйскіх юных камуністаў, якая выдала ўлётку з заклікам адстойваць яўрэйскія нацыянальныя правы ў СССР, супраціўляцца асіміляцыі і стварыць Яўрэйскую ССР у Палесціне [20, л. 404; 21, л. 29]. А ў 1927 г. адзначалася, што яўкамол як арганізацыя існуе сама па сабе, хаця і не карыстаецца ніякім уплывам у масах, але як легальная пляцоўка выкарыстоўваецца сіяністамі [22, л. 211].

Неабходна адзначыць, што камсамол падтрымліваў сувязь з сіяніскімі арганізацыямі для атрымання інфармацыі аб іх становішчы, але барацьбы з імі да ліпеня 1921 г. не вёў [12, л. 6, 67]. Гэта можна растлумачыць тым, што, з аднаго боку, у гэты час сіяністы падкрэслівалі сваю лаяльнасць да савецкай улады і кампартыі, а з другога – сярод тагачасных камсамольцаў большасць складалі яўрэі.

Увогуле ў пачатку 1920-х гг. сіяніскія юнацкія арганізацыі ў ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губернях былі невялікімі, уплыву ў Мінску і іншых гарадах не мелі і разгортвалі сваю дзейнасць пераважна ў мястэчках [23, с. 1], дзе сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын актыўна дзейнічалі і былі папулярнымі такія сіяніскія маладзёжныя арганізацыі, як «Гашомер-Гацаір», ці яўрэйскія скаўты (яе мэта – адпраўка ідэалагічна і фізічна падрыхтаваных маладых яўрэяў у Палесціну), «Гехалуц» (яе мэта – стварэнне сельскагаспадарчых і прафесійна-тэхнічных калектываў з яўрэйскай моладзі для перасялення ў Палесціну і працы ў земляробчых калоніях) і «Маккабі» (яе мэта – развіццё спорту сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын), якая асабліва ўзмацнілася ў 1922 г. [18, л. 2; 24, с. 42; 25, s. 109–110; 26, л. 19, 28–29]. Гэтыя арганізацыі заяўлялі аб сваёй апалітычнасці [27, л. 8–9] і ў першай палове 1920-х гг. мелі свае аддзяленні колькасцю па 30 – 50 чалавек у Гомелі, Бабруйску, Быхаве, Калінкавічах, Мазыры, Мінску, Новабеліцы, Новазыбкаве, Рагачове, Рэчыцы, Тураве, а ў Гомелі яшчэ нават знаходзіўся штаб Паўночна-Заходняй акругі «Гашомер-Гацаір» (у складзе С. Белкінай, Г. Галадца, М. Галадавенкі, Ю. Мазыраніна, Л. Сярэбранага, А. Цырлінай), якая ў 1923 г. налічвала 6 дружын агульнай колькасцю 350 – 400 чалавек [28, л. 59–62, 81–83; 29,

л. 5; 30, л. 10; 31, л. 91; 32, л. 206–208; 33, л. 39–40; 34, л. 6; 35, л. 25; 36; 37]. Як бачым, у гэты час найбольш папулярнымі былі юнацкія сіяніцкія арганізацыі, якія пазіцыянавалі сябе як апалітычныя, аднак яны тым не менш не мелі масавага характару.

Акрамя таго, у 1921 г. у Быхаве, Віцебску, Гомелі, Магілёве, Мінску, Оршы, Полацку, Рагачове і Шклове дзейнічалі арганізацыі ЯССРМ «ЮПЦ». Буйнейшымі з іх з'яўляліся Віцебская, Гомельская, Магілёўская і Рагачоўская. Прадстаўнікамі ЦК саюза ў ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губернях былі Папко і Блюм, але сувязь цэнтральнага кіраўніцтва з месцамі была дрэнная (добрая – толькі з Гомельскай і Магілёўскай арганізацыямі). Бюро ЦК ЯССРМ «ЮПЦ» выдавала для ССРБ і Паўночна-заходняй вобласці РСФСР адмысловы бюлетэнь. Усерасійская ўстаноўчая канферэнцыя саюза, сярод 32 дэлегатаў якой 12 (38 %) прадстаўлялі арганізацыі ЯССРМ «ЮПЦ» у Савецкай Беларусі, вызначыла яго галоўныя задачы – здзяйсненне сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі ў савецкіх рэспубліках і ўтварэнне яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі ў Палесціне [16, л. 7, 12; 38, л. 1; 39, с. 4–5, 9]. Як бачым, сацыялістычныя ідэі ў дзейнасці ЯССРМ «ЮПЦ» мелі перавагу над сіяніцкімі, а ў структурным плане амаль 40 % членаў саюза прыходзілася на Савецкую Беларусь.

З мэтай аналізу арганізацыйнага становішча ЯССРМ «ЮПЦ» у Савецкай Беларусі 25–28 верасня 1921 г. у Мінску адбыўся пленум Бюро ЦК саюза, які прызнаў слабай барацьбу з клерыкалізмам, працу ў ячэйках і клубах, але адзначыў ударны характар ліквідацыі палітычнай непісьменнасці, а таксама канстатаваў, што не ўсе мясцовыя члены ЯССРМ «ЮПЦ» прайшлі дапрызыўную падрыхтоўку [38, л. 4–5]. З гэтага вынікае, што галоўная ўвага саюза канцэнтравалася на супрацьстаянні клерыкальнаму іўдаізму, ліквідацыі палітычнай непісьменнасці (прапаганда і тлумачэнне палітычных пазіцый ЯССРМ «ЮПЦ» сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын), а таксама вайсковай падрыхтоўцы членаў саюза.

Аднак, нягледзячы на ўсе захады, у 1922 г. ЯССРМ «ЮПЦ» у Савецкай Беларусі стаў нешматлікім, а частка яго былых членаў увогуле ўступіла ў ЯКСМ [17, л. 13]. Гэта, хутчэй за ўсё, сведчыць аб паспяховай канкурэнцыі з боку апошняга і аб большай папулярнасці ў асяроддзі мясцовых маладых яўрэяў ідэі адстойвання сваіх нацыянальных правоў менавіта на тэрыторыі савецкіх рэспублік.

У 1923–1925 гг. у Савецкай Беларусі дзейнічалі і іншыя маладзёжныя сіяніцкія арганізацыі, але яны не былі масавымі. Гэта Арганізацыя сіяніцкай моладзі (АСМ), якая мела правы кірунак, і «Гехавер», які аб'ядноўваў юнакоў і дзяўчын з ліку студэнтаў, дэклараваў сваю апалітычнасць, але адмоўна ставіўся да савецкай улады [20, л. 265; 26, л. 136 – 137; 40; 41; 42, л. 424, 434; 43, л. 23].

У сваю чаргу савецкія ўлады прадпрымалі захады па барацьбе з сіяністамі, бо імкнуліся захаваць уплыў на маладых яўрэяў. Так, мясцовыя ўлады былі абавязаны сачыць за сіяніцкімі групамі і неадкладна дакладваць аб іх дзейнасці ў райкамы (РК) КП(б)Б і ДПУ [44, л. 74].

У 1922 г. у Гомелі мясцовыя ўлады дазволілі правесці з'езд «Гехалуца», пасля чаго правялі масавыя арышты яго ўдзельнікаў [45, с. 17]. У выніку ў пачатку студзеня 1923 г. былі выяўлены шматлікія факты цеснай сувязі і ўзаемадзеяння «Гехалуца» з іншымі формамі сіяніцкага руху [46, с. 40–41].

Распрацоўваліся і спецыяльныя метады барацьбы з сіяніцкімі сацыялістычнымі юнацкімі арганізацыямі [28, л. 61].

Імкненне пазбегнуць перашкод і рэпрэсій у працы раскалола «Гехалуц» у 1923 г. на афіцыйны «Гехалуц у СССР» (левае крыло, зарэгістраванае ў Маскве) і нелегальную Нацыянальна-працоўную арганізацыю «Гехалуц» (правае крыло). Левая плынь адкалолася і ад «Гашомер-Гацаір». Аднак і левым плыням гэтых арганізацый савецкія ўлады перашкаджалі ў працы, арыштоўвалі іх членаў. У ССРБ нават не было зарэгістравана прадстаўніцтва «Гехалуц у СССР» [25, s. 110]. Нягледзячы на гэта, у 1923 г. у Гомелі дзейнічаў РК «Гехалуц у СССР», які ўзначальвалі М. Гранц, А. Цырлін і К. Буднік. Камітэт налічваў 25–30 чалавек і меў цесную сувязь з ЦК «Гехалуц у СССР», выконваў вялікую колькасць нарадаў на адпраўку яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын у сельскагаспадарчыя калоніі і майстэрні Крыма і іншых рэгіёнаў СССР. У вучэбных групах РК абавязкова вывучаўся іўрыт. Цікава, што камітэт адмоўна ставіўся да прыняцця новага «легальнага» статута «Гехалуц у СССР», разглядаючы гэта як вымушаную меру [28, л. 61]. Як бачым, выдзяленне

моладзевымі сіянісцкімі арганізацыямі левых плыняў мела хутчэй тактычныя мэты і не вяло да змены іх асноўных напрамкаў дзейнасці, што выдатна ўсведамлялі савецкія ўлады, якія працягвалі сваю антысіянісцкую палітыку і ў адносінах да левых сіяністаў.

У 1923 г. савецкімі ўладамі былі паспяхова ліквідаваны арганізацыйныя структуры «Маккабі». Пры гэтым толькі дзе-нідзе былі выкарыстаны арышты. ЦБ маккабістаў дало падпіску аб спыненні працы, але адначасова хадайнічала аб легалізацыі. Аднак яно было пакінута без наступстваў, бо ў час ліквідацыі ў цэлым шэрагу месцаў выявіліся сувязь маккабістаў з сіяністамі і іх агульныя антысавецкія дзеянні [47, л. 7]. Канчаткова «Маккабі» спыніў сваю дзейнасць у БССР у 1924 г. [42, л. 424, 434]. Нягледзячы на гэта, у Бабруйскім, Мазырскім і Слуцкім паветах ССРБ сярод яўрэйскай моладзі (пераважна саматужнікаў і навучэнцаў) працягвалі падпольна дзейнічаць сіянісцкія гурткі [48, л. 34, 41; 49, л. 26; 50, л. 5, 8–9, 83, 90; 51, л. 21].

У кастрычніку – снежні 1924 г. адзначаўся рост адмоўнага стаўлення да ЛКСМБ яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын, бо ў большасці выпадкаў праца камсамола сярод маладых яўрэяў вялася на рускай мове. У выніку сярод яўрэйскай моладзі актывізаваўся рост сіянісцкага руху («Гехалуц», «Гашомер-Гацаір», ЯССРМ «ЮПЦ» і інш.). Цэнтр гэтых арганізацый у Беларусі знаходзіўся ў Мінску. Яны значна ўмацаваліся і актыўна дзейнічалі ў Слуцку. Калі раней у іх уваходзілі толькі дзеці крамнікаў, кантрабандыстаў, буйных саматужнікаў, навучэнцы ССНУ і ВНУ (асабліва адлічаныя ў выніку чыстак), то ў 1924 г. – яшчэ юнакі і дзяўчыны з ліку рабочых і служачых. Рост сіянісцкага руху назіраўся асабліва ў мястэчках, дзе яго арганізацыі выступалі часам адкрыта, што тлумачылася ростам беспрацоўя сярод мясцовых маладых яўрэяў і адсутнасцю там працы камсамола. У гэты час у БССР выдаваліся 5 перыядычных нелегальных сіянісцкіх газет, якія распаўсюджваліся і сярод моладзі. Юнацкія сіянісцкія арганізацыі ў БССР вялі працу і ў гуртках культурнага напрамку пад сцягам супрацьстаяння асіміляцыі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын мясцовым насельніцтвам, а ў некаторых мястэчках нават дзейнічалі нелегальныя хедэры [52, л. 48, 50, 52 – 53; 53, л. 163; 54, л. 3].

У БССР у 1924 г. зноў пашырыўся і ўмацаваўся ЯССРМ «ЮПЦ». Але некаторыя яго камітэты ў рэспубліцы мелі фінансавыя даўгі перад цэнтральным кіраўніцтвам саюза. ЯССРМ «ЮПЦ» вызначаўся большым радыкалізмам у параўнанні з Сіянісцка-сацыялістычным саюзам моладзі (СССМ), з якім варагаваў, хаця ў пэўны час ставілася пытанне аб іх зліцці [21, л. 6–7], што сведчыць аб наяўнасці імкнення сіянісцкіх сацыялістычных арганізацый да канцэнтрацыі. ЯССРМ «ЮПЦ» выдаваў газету «Унзере едыес», а Беларускі сакратарыят саюза выпускаў яшчэ і часопіс «Югенд веккер». ЯССРМ «ЮПЦ» хоць і быў невялікім па колькасці, але меў добра арганізаваны падпольны апарат і ў вялікіх гарадах яго ўплыў быў дастаткова моцным. Мясцовыя структуры саюза атрымлівалі падрабязныя інструкцыі аб метадах працы, выдавалі ўлёткі. ЯССРМ «ЮПЦ» амаль падзяляў лозунгі Камінтэрна, але выступаў супраць камуністычнай дыктатуры, за саветы без камуністаў, свабоду рэвалюцыйнай думкі, даводзіў, што савецкая ўлада эксплуатуе рабочых, а павышэнне прадукцыйнасці працы – гэта мадэрнізаваная «патагонная сістэма». Як бачым, саюз адышоў ад лаяльнага стаўлення да савецкай улады. У цэлым у ЯССРМ «ЮПЦ» па-ранейшаму меншывізм перавышаў сіянізм. У саюзе меўся інстытут кандыдатаў (для рабочых быў меншы кандыдацкі стаж) і кантрольныя камісіі, а мясцовыя арганізацыі не зацвярджаліся без папярэдняга наведвання інструктарам ЦК. ЯССРМ «ЮПЦ» усяляк імкнуўся прыцягнуць у свой склад маладых рабочых (з гэтай мэтай яго актыў імкнуўся патрапіць на прадпрыемствы ў якасці вучняў і г. д.) і асабліва камсамольцаў [26, л. 105–108, 117–120; 55, л. 66]. Такую ўвагу да апошніх можна растлумачыць як жаданнем аслабіць канкурэнтную маладзёжную арганізацыю, так і імкненнем залучыць у свае шэрагі членаў з вопытам саюзнай працы.

СССМ жа быў створаны пры Сіянісцка-сацыялістычнай партыі. Яго Беларускі раённы камітэт выдаваў штомесячнік «Форвертс». Аднак саюз у Беларусі ў 1924 г. быў слабы і толькі пачынаў пашырацца [26, л. 28, 72, 81, 93].

ЯССРМ «ЮПЦ» і СССМ былі звязаны з ІІ Інтэрнацыяналам і ажыццяўлялі меншавіцкую палітыку. Пры гэтым яны пачалі радыкалізоўвацца і выкарыстоўваць больш радыкальныя метады барацьбы: збіваць камсамольцаў, зрываць гальштукі з піянераў, перашкаджаць правядзенню іх сходаў. Сіяністы таксама выпускалі пракламацыі, шэраг перыядычных і неперыядычных выданняў

для моладзі, якія перавышалі па колькасці камсамольскія і піянерскія [56, л. 65], што сведчыць аб наяўнасці моцных крыніц фінансавання сіяніскага руху.

У пачатку 1925 г. амаль абсалютна быў спынены прыём у камсамол «іншых», якія ў БССР у большасці з'яўляліся яўрэямі, што падштурхнула іх да ўступлення ў сіяніскія арганізацыі. Каб перашкодзіць гэтаму, ЛКСМБ вымушаны быў зноў павялічыць працэнт «іншых» у саюзе [52, л. 4–5; 57, л. 24]. Аднак сярод юнацкіх сіяніскіх арганізацый выпадкі выхаду з іх складу рабочых юнакоў і дзяўчын былі адзначаны толькі ў «Гехалуцы» [58, л. 65]. Увогуле многія маладыя яўрэі, хоць і ўступалі ў камсамол, але працягвалі заставацца членамі падпольных сіяніскіх арганізацый [59, с. 152], якія ў шматлікіх мястэчках былі мацней камсамольскіх ячэек і піянерскіх атрадаў. Больш таго, сіяністы пранікалі ў камсамол, каб ідэалагічна разваліць яго ячэйкі і перацягнуць камсамольцаў да сябе [25, s. 102–103; 60, л. 16; 61, л. 5]. Усё гэта сведчыць аб моцы і ўплывовасці сіяніскага руху ў маладзёжным асяроддзі ў той час.

З мэтай барацьбы з уплывамі сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі ЛКСМБ выкарыстоўваў лекцыі і даклады аб сутнасці сіянізму, вечары пытанняў і адказаў, прапаганду інтэрнацыянальнага сяброўства [59, с. 153]. Аднак пры гэтым барацьба з сіянізмам слаба асвятлялася ў камсамольскай прэсе [62, л. 29], многія з арганізацый саюза і часткова яго актыў былі не знаёмы з сутнасцю сіянізму [60, л. 139], а некаторыя камсамольцы ўвогуле добра адносіліся да сіяністаў [63, л. 54]. Такое становішча сведчыць аб адсутнасці эфектыўнай рэальна разгорнутай барацьбы камсамола з сіянізмам.

Разам з тым у 1925 г. масавыя арышты сіяністаў былі праведзены ў Гомелі, таму штаб Паўночна-Заходняй акругі «Гашомер-Гацаір» вымушаны быў пераехаць у Бабруйск. Аднак арышты працягваліся і там. К сярэдзіне 1926 г. па колькасці арыштаваных членаў «Гашомер-Гацаір» Гомель займаў другое месца ў СССР [64, с. 78–80].

Увогуле супраць сіяніскіх актывістаў з дапамогай ДПУ ўжываліся метады дыскрэдытацыі, вобыскі і арышты, суд за закрытымі дзвярыма і высылка на тэрмін да 3 гадоў у Сібір, Казахстан ці Сярэднюю Азію. У выніку праз турмы і высылкі прайшла значная частка актыўных маладых сіяністаў БССР. Пазбегчы арышту можна было толькі выехаўшы за межы Савецкай Беларусі, але ДПУ БССР адсочвала карэспандэнцыю і перадавала падазроныя лісты спецаддзелам у іншых рэгіёнах СССР для распрацоўкі. Пры гэтым часам замест пакарання яўрэйскім юнакам і дзяўчынам дазвалялі эміграваць у Палесціну [37; 65, л. 166; 66].

Як бачым, метады і падыходы савецкіх улад у справе аслаблення сіяніскага руху былі разнастайнымі і пры неабходнасці вар'іраваліся.

Аднак колькасны склад юнацкіх сіяніскіх араганізацый у Савецкай Беларусі павялічваўся, нягледзячы на рэпрэсіўныя меры ў адносінах да іх [53, л. 163; 60, л. 138]. Так, за 1924–1925 гг. сіяніскія арганізацыі ў БССР значна ўмацаваліся за кошт моладзі. Сярод маладых яўрэяў, асабліва з ліку гандляроў, саматужнікаў, членаў сельскагаспадарчых арцеляў, навучэнцаў і студэнтаў, назіраўся рост уплыву сіяністаў і антыкамуністычных настрояў. Студэнты вялі актыўную сіяніскую працу і ў рэгіёнах, калі прыязджалі да сваіх родных, а ў некаторых навучальных установах нават дзейнічалі сіяніскія ячэйкі. Таксама ў сіяністаў была добра пастаўлена фізкультурная праца (групы «Маккабі»), што прыцягвала юнакоў і дзяўчын [53, л. 3; 56, л. 69; 58, л. 7; 60, л. 40; 63, л. 50, 55, 72; 67, л. 62; 68, л. 5, 12; 69, л. 2; 70, л. 133; 71, л. 78].

Увогуле ў БССР у 1925 г. СССМ, «Гехолуц», «Гашомер-Гацаір» і іншыя маладзёжныя сіяніскія арганізацыі налічвалі 5 тысяч чалавек (асабліва моцныя арганізацыі былі ў Мінскай, Бабруйскай, Мазырскай, Слуцкай акругах) і вялі масавую працу [72, л. 5].

У 1926 г. сярод сіяністаў Савецкай Беларусі захоўваўся вялікі працэнт моладзі. Гэтаму спрыялі вельмі дрэнны матэрыяльны стан маладых саматужнікаў, адмоўнае стаўленне камсамольцаў да дэкласаванай моладзі. Сіяніскія арганізацыі бралі ў свае рукі ініцыятыву ў працаўладкаванні яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын праз перамовы з саматужнікамі, пасылку на курсы бухгалтараў і рахункаводаў, забеспячэнне матэрыяльнымі сродкамі. Пры гэтым прэса ЛКСМБ па-ранейшаму амаль не асвятляла барацьбу з сіянізмам [56, л. 66–68].

Найбольш актыўнымі сіяністы былі ў Бабруйскай акрузе, дзе амаль ва ўсіх гарадах і мястэчках (асабліва ў Жлобіне, Рагачове, Бабруйску, Лапічах, Глуске, Свіслачы, Парычах, Коўчыцах) яны ахоплівалі сваім уплывам каля 45 % працоўнай яўрэйскай моладзі [56, л. 135; 73, с. 7; 74, л. 17].

У чэрвені 1926 г. паспрабаваў актывізаваць дзейнасць сярод маладых яўрэяў Савецкай Беларусі ЯССРМ «ЮПЦ» [70, л. 63], але безвынікова, бо напрыканцы гэтага года ён амаль зусім зышоў з палітычнай сцэны. За яго кошт узрос і ўмацаваўся больш правы СССМ [75, л. 1]. «Папраўленне» назіралася і ў іншых юнацкіх сіяніцкіх сацыялістычных арганізацыях. Так, «Цэірэйціон» у Мінску вылучыў клерыкальныя патрабаванні суботняга адпачынку і аднаўлення хедэр [21, л. 30]. Такое становішча, на наш погляд, сведчыць аб тым, што на левым палітычным полі перавагу ў барацьбе за яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын атрымаў камсамол.

У гэты час самай буйной маладзёжнай сіяніцкай арганізацыяй у БССР з'яўляўся СССМ. Асабліва моцным быў яго ўплыў у мястэчках, дзе ён актыўна дзейнічаў праз яўрэйскія школы, крэдытныя таварыствы і таварыствы саматужнікаў [76, л. 135]. У саюз уваходзілі старыя сіяніцкія прафесіяналы з былых юнацкіх арганізацый «Кадымо», «Гехавер», «Штадрут». Іх сацыялізм абмяжоўваўся лозунгам падрыхтоўкі працаўнікоў для Палесціны. СССМ меў даволі моцны апарат, выдаваў перыядычныя часопісы і газеты: «Сионистская социалистическая мысль» – цэнтральны орган саюза, «Форвертс» – орган Беларускага раённага камітэта. СССМ выступаў за задавальненне сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і культурных патрэб працоўнай яўрэйскай моладзі; пабудову яўрэйскай сацыялістычнай дзяржавы ў Палесціне; стварэнне яўрэйскіх аўтаномій у краінах, дзе пражывалі яўрэі; саюз у барацьбе за сацыялізм з усімі працоўнымі ўсіх нацыянальнасцей [21, л. 17]. Як бачым, для СССМ сіяніцкія мэты былі больш прыярытэтнымі, чым для ЯССРМ «ЮПЦ».

«Гехалуц у СССР», які пазіцыянаваў сябе як апалітычная арганізацыя, нягледзячы на памяншэнне колькасці, сваіх членаў (іх засталося каля 30 % ад першапачатковай колькасці), паспяхова распачаў працу ў яўрэйскіх сельскагаспадарчых калектывах. Пры гэтым ён нават атрымліваў дапамогу ад савецкіх і партыйных органаў у якасці крэдытаў і субсідый для прадпрыемстваў [21, л. 32].

Аднак канец 1926 г. характарызаваўся распадам цэлага шэрага мясцовых структур юнацкіх сіяніцкіх арганізацый (пераважна левага кірунку), паслабленнем іх уплыву з-за паляпшэння эканамічнага становішча на маладых яўрэяў мястэчак, ліберальнга курсу партыі ў адносінах да саматужнікаў (ільготы), што дазволіла прыцягнуць у іх шэрагі вялікую колькасць юнакоў і дзяўчын [21, л. 2; 22, л. 206; 70, л. 185; 77, л. 588]. Таму сіяністы пераарыентавалі сваю працу на яўрэйскія сельскагаспадарчыя калектывы, дзе мелася моладзь. Была нават створана сіяніцкая сельгаскамуна «Піянер». Адначасова павялічылася ўздзеянне клерыкальнага іўдаізму на маладых яўрэяў, ствараліся рознага роду рэлігійныя групы юнакоў і дзяўчын [21, л. 4; 22, л. 211].

У 1927 г. сіяніцкія маладзёжныя арганізацыі ў БССР налічвалі ўжо толькі 1500 чалавек. Працу «Гашомер-Гацаір» тармазіў недахоп работнікаў і фінансаў. Шэраг сіяніцкіх груп распаўся і іх члены апублікавалі ў друку заявы аб разрыве з сіянізмам. Пры гэтым былыя сіяністы вельмі імкнуліся ўступіць у ЛКСМБ [22, л. 210; 75, л. 10 – 11; 78, л. 66–68].

Трэба адзначыць, што калі раней сіяністы вылучалі толькі яўрэйскія нацыянальныя лозунгі, то зараз – і агульнаменшавіцкія. Калі раней яны ўсяляк падкрэслівалі, што не маюць нічога супраць савецкай улады і нават кампартыі (толькі супраць дыктатуры яўсекцыі), то зараз разгарнулі адкрытую барацьбу з кампартыяй пад лозунгам «Далоў ВКП(б)». Праграмныя дакументы сіяністаў на першым месцы мелі агульныя меншавіцкія патрабаванні: свабода друку, легалізацыя ўсіх палітычных партый, вызваленне ўсіх вязняў-сацыялістаў, адмена цэнзуры, свабода сходаў, тайнае галасаванне на выбарах і г. д.; а на другім – яўрэйскія нацыянальныя патрабаванні: працоўная нацыянальна-персанальная аўтаномія, яўрэйскія саветы з цэнтральнымі выканаўчымі органамі і асобнымі з'ездамі, яўрэйская кааперацыя з асобным яўрэйскім цэнтральным органам, асобныя яўрэйскія нацыянальныя вайсковыя часці, аддзяленне асобнага яўрэйскага бюджэту з агульнадзяржаўнага бюджэта, стварэнне асобных яўрэйскіх прадпрыемстваў з агульнадзяржаўных сродкаў для ліквідацыі беспрацоўя сярод яўрэйскага насельніцтва і г. д. [75, л. 2].

Аднавіла сваю дзейнасць Яўрэйская камуністычная партыя, якая пачала арганізоўваць Яўрэйскі камуністычны саюз моладзі [79, л. 10].

У цэлым жа працягваўся распад сіяніцкіх арганізацый з-за эканамічных мерапрыемстваў савецкіх улад і шырокай растлумачальнай працы КП(б)Б і ЛКСМБ. Пры гэтым зняволеныя маладыя сіяністы вызваляліся, калі рабілі публічныя заявы аб разрыве з сіяніцкім рухам, якія публікаваліся ў прэсе. Але выхадцы з гэтых арганізацый траплялі ў камсамол і распаўсюджвалі там сіяніцкія настроі. У выніку асобныя ячэйкі ЛКСМБ былі падзелены па нацыянальнай прыкмеце [80, л. 80]. Увогуле сярод некаторых камсамольцаў-яўрэяў і яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын, якія знаходзілася пад уплывам дробнабуржуазнага асяроддзя, меліся нацыяналістычныя настроі [81, л. 347].

У 1928–1929 гг. сярод шырокіх мас яўрэйскай моладзі зноў актывізаваліся сіяністы [59, с. 164]. Так, у верасні 1928 г. у Мінску дзейнічала моцная сіяніцкая арганізацыя моладзі [21, л. 5]. Аднак напрыканцы 1929 г. савецкімі ўладамі з дапамогай ЛКСМБ былі ліквідаваны арганізаваныя сіяніцкія групы ў БССР і іх уплыў на маладых яўрэяў-працоўных, дзякуючы працы па паляпшэнні іх эканамічнага становішча [82, л. 99].

Такім чынам, у 1920-я гады развіццё яўрэйскіх юнацкіх арганізацый адбывалася па двух напрамках: камуністычным і сіяніцкім.

У пачатку 1920-х гадоў яўрэі актыўна спрабавалі захаваць на камуністычным палітычным полі асобны маладзёжны яўрэйскі сектар праз дзейнасць яўкамола, які меў значныя матэрыяльныя сродкі і да 1923 г. з'яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын. Аднак з-за супрацьдзеяння савецкіх улад наладзіць працу ЯКСМ не ўдалося, таму было прынята рашэнне аб ліквідацыі саюза і ўступленні яго членаў у камсамол. Нягледзячы на гэта, канчатковага зліцця не адбылося і аж да 1928 г. у БССР адзначалася дзейнасць асобных невялікіх груп яўкамола, але яны фактычна не мелі ўплыву на яўрэйскую моладзь.

Сіяніцкія юнацкія арганізацыі ў Савецкай Беларусі можна падзяліць на тры групы: правыя, адукацыйна-культурныя і левыя. Да правых адносіліся АСМ і іншыя больш дробныя групоўкі; да адукацыйна-культурных – «Гашомер-Гацаір», «Гехавер», «Гехалуц», «Маккабі», да левых – ЯССРМ «ЮПЦ», СССМ і «Цэірэй-ціон». Пры гэтым калі ў першай палове 1920-х гг. найбольш буйной арганізацыяй з'яўляўся «Гехалуц», то ў другой палове – СССМ.

У пачатку 1920-х гг. сіяніцкія маладзёжныя арганізацыі ў Савецкай Беларусі былі невялікімі, уплыву ў гарадах не мелі і разгортвалі сваю дзейнасць пераважна ў мястэчках. У гэты час найбольш папулярнымі былі адукацыйна-культурныя юнацкія сіяніцкія арганізацыі, якія пазіцыянавалі сябе як апалітычныя.

Савецкія ўлады прадпрымалі захады па барацьбе з сіяністамі. Пры гэтым метады і падыходы ў справе аслаблення сіяніцкага руху былі разнастайнымі (ад інфармацыйна-прапагандысцкіх да рэпрэсіўных) і пры неабходнасці вар'іраваліся. Разам з тым камсамол Савецкай Беларусі здолеў разгарнуць эфектыўную барацьбу з сіянізмам толькі напрыканцы 1920-х гг.

Імкненне пазбегнуць перашкод і рэпрэсій прывяло да адасаблення левых плыняў ад «Гехалуца» і «Гашомер-Гацаіра». Але гэта быў фармальны тактычны крок, які не прывёў да змены асноўных напрамкаў дзейнасці арганізацый, што выдатна ўсведамлялі савецкія ўлады, якія працягвалі ў дачыненні да іх антысіяніцкую палітыку. Аднак, нягледзячы на ўсе захады савецкіх улад, колькасны склад моладзевых сіяніцкіх араганізацый у Савецкай Беларусі павялічваўся і дасягнуў свайго піка ў 1925 г.

Увогуле ў сярэдзіне 1920-х гг. юнацкія сіяніцкія арганізацыі пачалі радыкалізоўвацца і выкарыстоўваць адпаведныя метады барацьбы. Дзякуючы наяўнасці моцных крыніц фінансавання, яны павялічылі выпуск пракламацый, перыядычных і неперыядычных выданняў для маладых яўрэяў, якія перавышалі па колькасці камсамольскія і піянерскія. Разам з тым пачалося пранікненне сіяністаў у камсамол з мэтай ідэалагічна разваліць яго ячэйкі і перацягнуць яўрэяў-камсамольцаў да сябе.

Але ў выніку ўзмацнення процідзеяння савецкіх улад і паляпшэння экнамічнага становішча яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын ужо з канца 1926 г. назіралася паслабленне ўплыву маладзёжных сіяніцкіх арганізацый і распад іх мясцовых структур.

Апошняя спроба актывізацыі дзейнасці сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі назіралася ў 1928–1929 гг. Аднак яна была беспаспяховай. Напрыканцы 1929 г. арганізаваныя юнацкія сіяніцкія групы былі ліквідаваны.

## Літаратура


1. *Eberhardt, P.* Przemiany narodowościowe na Białorusi / P. Eberhardt. – Warszawa: Editions spotkania, 1994. – 182 s.

2. *Altshuler, M.* Soviet Jewry on the Eve of the Holocaust. A Social and Demographic Profile / M. Altshuler. – Jerusalem: Yad Vashem, 1998. – 349 p.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 11.

4. Бюллетень Центрального комитета Еврейского коммунистического союза молодёжи. – 1921. – 15 дек.

5. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 31.

6. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 74.

7. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 36.

8. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 38.

9. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 37.

10. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 40.

11. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 35.

12. РДАСПГ. – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 32.

13. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 34.

14. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 29.

15. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 47.

16. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 76.

17. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 88.

18. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 90.

19. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 23.

20. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 10. Спр. 29.

21. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 149.

22. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 174.

23. Красная смена. – 1922. – 14 апр.

24. *Иоффе, Э. Г.* Деятельность организации «Хашомер-Хацоир» в Беларуси (1924–1926) и создание кибуца в Палестине / Э. Г. Иоффе // Форум. – 1996. – № 4. – С. 41–45.

25. *Замойскі, А.* Стасункі паміж жыхарамі мястэчак Беларусі і савецкай уладай у 1918–1928 гг. / А. Замойскі // Białoruskie zeszyty historyczne. – № 29. – Białystok, 2008. – S. 91–114.

26. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 86.

27. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 23.

28. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГВ). – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1229.

29. ДАГАГВ. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1578.

30. ДАГАГВ. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 355.

31. ДАГАГВ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 226.

32. ДАГАГВ. – Ф. 69. Воп. 1. Спр. 82.

33. ДАГАГВ. – Ф. 69. Воп. 1. Спр. 248.

34. ДАГАГВ. – Ф. 69. Воп. 1. Спр. 959.

35. ДАГАГВ. – Ф. 69. Воп. 2. Спр. 248.

36. *Котовенко, А.* Сионистские молодёжные организации социалистического толка в Гомеле в 1920-е гг. / А. Котовенко // Беларусь у XX стагоддзі: сб. науч. работ / науч. ред.: В. Андреев. – Вып. III. – Минск: [б. и.], 2004. – С. 121–129.

37. *Смиловицкий, Л.* Сионистский след в Турове / Л. Смиловицкий // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ / науч. ред.: В. Андреев. – Вып. III. – Минск: [б. и.], 2007. – С. 264–294.

38. РДАСПГ. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 30.

39. Резолюции Всероссийск. Учредительн. Конференции. Программа и устав Е. С. С. Р. М. «Югенд Поалей-цион». – М.: 20-я гос. тип., 1921. – 31 с.

40. *Пушкін, І. А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. ХХ ст.) / І. А. Пушкін // Магілёўская даўніна. – Магілёў: [б. в.], 1998. – С. 32–38.

41. *Пушкін, І. А.* Удзел яўрэяў г. Магілёва ў грамадска-палітычным і культурным жыцці (1917 – канец 30-х гадоў ХХ ст.) / І. А. Пушкін // Этнаграфія беларускага Падняпроўя: матэрыялы навук. канф. 30 лістапада – 1 снежня 1999 г. / Склад. В. М. Аненкаў, Л. А. Сугака, С. Б. Рыбакова. – Магілёў: Выд-ва МДУ імя А. А. Куляшова, 1999. С. 30–40.

42. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 56. Воп. 5. Спр. 1.

43. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 10. Спр. 124.

44. ДАГАГВ. – Ф. 623. Воп. 1. Спр. 1.

45. *Басин, Я.* Разгром сионистского движения в советской Белоруссии / Я. Басин // Авив. – 2003. – № 6–7. – С. 17.

46. *Эйстрах, Г.* Еврейская секция компартии: по материалам бывшего центрального партархива / Г. Эйстрах // Вестн. еврейск. ун-та в Москве. – 1994. – № 2. – С. 35–45.

47. ДАГАГВ. – Ф. 69. Воп. 1. Спр. 260.

48. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 29.

49. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 20.

50. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 22.

51. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 31.

52. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 37.
53. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 49.
54. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 177.
55. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 41.
56. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 64.
57. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 42.
58. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 122.
59. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1975. – 536 с.
60. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 84.
61. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 123.
62. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 46.
63. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 121.
64. *Глушаков, Ю.* Деятельность еврейских социалистических организаций в Гомеле в первой четверти XX в. / Ю. Глушаков // Евреи в Гомеле. История и культура (конец XIX – начало XX в.): сб. материалов науч.-теорет. конф., Гомель, 21 сентября 2003 г. – Гомель: ОО «ГОЕО Ахдут», 2004. – С. 69–81.
65. ДАГАГВ. – Ф. 3952. Воп. 1а. Спр. 14.
66. *Izmozik, V.* Soviet Jewry as Reflected in Letters Intercepted by the Leningrad OGPU, 1924–1925 / V. Izmozik // Jews in Eastern Europe. – 1994. – № 1(23). – P. 32–46.
67. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 39.
68. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 44.
69. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 54.
70. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 62.
71. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 188.
72. НАРБ. – Ф. 6 3п. Воп. 2. Спр. 128.
73. Бюллетень ЦБ евсекции ЦК ВЛКСМ. – 1927. – № 1. – 7 с.
74. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 216.
75. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 275.
76. НАРБ. – Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17.
77. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 64а.
78. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 10. Спр. 53.
79. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 65.
80. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 306.
81. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 1. Спр. 81.
82. НАРБ. – Ф. 63 п. Воп. 2. Спр. 465.

*V. V. DANILOVICH*

**JEWISH YOUTH ORGANIZATIONS OF THE SOVIET BELARUS (1921–1929 YEARS)**

## Summary

Article deals with the problem of Jewish youth organizations in the Soviet Belarus. During the 1920th the development of Jewish youth organizations took place on two fronts: the Communist and Zionist.

Jewish Communist Youth League until 1923 was a real competitor with Komsomol among Jewish boys and girls.

Zionist youth organization in the Soviet Belarus has been divided into three groups: the right, educational, cultural, and left. Zionist youth organization and other smaller groups have been related to the right groups. Gashomer-Gatsair, Gehover, Hehalutz, Makkabi have been related to educational and cultural ones. The Jewish Socialist Working Youth Union «Jugend Poalei Zion», Zionist-Socialist Union of Youth and Tseirey Zion have been related to the left group.

In the first half of 1920th the largest Jewish youth organization was Hehalutz, but in the second half it was the Zionist-Socialist Union of Youth. Soviet authorities used various methods of dealing with the Zionists (from advocacy to repressive). However, the Young Communist League of the Soviet Belarus was able to deploy an effective struggle against Zionism only in the late 1920th. Due to the stronger response to the Soviet authorities and to improve the economic situation Jewish boys and girls began to fall under the influence of youth Zionist organizations since the end of 1926. Then the collapse of their local structures has begun. Zionist groups organized by youth have been eliminated to the end of 1929.